УДК 811.161.3

ШЛЯХІ ВЫЗНАЧЭННЯ ПРЫКАЗКАВАГА МІНІМУМУ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ (па-за сацыялінгвістычным эксперыментам)[1*]

Доўгая Юлія Аляксандраўна
магістр філалагічных навук,
аспірант кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства,
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)
e-mail: yuliyadolgaya12@gmail.com

У артыкуле разглядаецца паняцце "парэміялагічны мінімум мовы", даецца кароткі аналітычны агляд яго крытычнага асэнсавання ў працах айчынных і замежных мовазнаўцаў, вызначаецца альтэрнатыўны спосаб даведацца, якія прыказкі складаюць "парэміялагічны мінімум мовы" (на падставе антыпрыказак).

Ключавыя словы: мова, маўленне, парэміялогія, прыказка, парэміялагічны мінімум, антыпрыказка.

[1*] Даследаванне выканана ў межах НДР "Беларуская фразеалогія, парэміялогія, моўная афарыстыка ў кантэксце еўрапейскіх моў і культур (сінхранічны і дыяхранічны аспекты)" Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гг.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

The article considers the concept of "paremiological minimum of a language", provides a brief analytical review of its critical study in the works of native and foreign linguists, defines alternative way to find out which proverbs constitute the "paremiological minimum of language" (based on anti-proverbs).

Keywords: language, speech, paremiology, proverb, paremiological minimum, anti-proverbs

Адна з актуальных праблем вывучэння беларускай парэміялогіі ў агульнаеўрапейскім кантэксце – гэта выяўленне колькасных параметраў парэміялагічнага фонду беларускай мовы [4] з улікам яго дыферэнцыяцыі на падставе рэлевантных у лінгвістычным плане функцыянальных характарыстык і ўласцівасцей прыказак.

Распрацоўка тэарэтычных і прыкладных праблем функцыянальнай дыферэнцыяцыі парэміялагічнага фонду з'яўляецца надзённай праблемай не толькі беларускага мовазнаўства, але і лінгвістыкі ў цэлым, асабліва такой яе асобнай дысцыпліны, што імкліва развіваецца ў апошні час, як парэміялогія [20], [21]. У межах парэміялогіі пытанне аб парэміялагічным мінімуме застаецца адным з найбольш вострых і дыскусійных.

Парэміялагічны фонд беларускай мовы звычайна дыферэнцуецца даследчыкамі на пяць асноўных разнавіднасцей:

1) агульны корпус прыказак, зафіксаваных у беларускай мове, які налічвае некалькі дзясяткаў тысяч адзінак (у самым вялікім зборніку прыказак М. Е. Грынблата [25] прадстаўлена звыш 12 тысяч адзінак);

2) корпус прыказак, якія ўжываюцца ў беларускай літаратурнай мове, складае, па розных ацэнках, ад 750 [28] да 1800 адзінак [19];

3) асноўны прыказкавы (парэміялагічны) фонд беларускай мовы, які ўпершыню вызначаны і апісаны параўнальна нядаўна [5,] [6], [13], [15], [30], які налічвае каля 650 прыказак [11, с. 92–93], найбольш устойлівых па сваёй лексічна-граматычнай форме, функцыянальна актыўных на працягу апошніх двух стагоддзяў і зафіксаваных у найбольш старажытных парэміяграфічных крыніцах [10];

4) прыказкавы (парэміялагічны) мінімум беларускай мовы, які быў вызначаны двойчы ў пачатку 2000-х гг. М.Ю. Котавай [17], [18] і Я.Я. Івановым [15], [29], [30] і які, адпаведна, двойчы ўдакладняўся паводле розных якасных і колькасных параметраў [11, с. 99–106], [27].

5) індывідуальны прыказкавы (парэміялагічны) фонд, або запас прыказак моўнай асобы (парэмікон), які на матэрыяле беларускай мовы яшчэ толькі пачынае фіксавацца па матэрыялах запісаў вусных тэкстаў асобных носьбітаў беларускага фальклору [3], [16].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Найбольш тэарэтычна абгрунтаванай, практычна распрацаванай і запатрабаванай у прыкладным плане разнавіднасцю парэміялагічнага фонду беларускай мовы з'яўляецца прыказкавы мінімум, які стаў актыўна прымяняцца ў супастаўляльных і лінгвакультуралагічных апісаннях беларускіх прыказак. У прыватнасці, выкарыстаны ў шэрагу двухмоўных парэміялагічных слоўнікаў – беларуска-нямецкім [2], польска-беларускім [24], руска-беларускім [26], англа-беларускім [1], а таксама пры апісанні нацыянальна-культурнай адметнасці беларускіх прыказак [22], [23].

Разам з тым, парэміялагічны мінімум беларускай мовы, на наш погляд, застаецца недастаткова распрацаванай навуковай праблемай як у плане свайго вызначэння, так і з пункту гледжання свайго выкарыстання ў розных прыкладных мэтах (найперш, у лексікаграфіі і лінгвадыдактыцы).

Так, асноўнай праблемай вызначэння парэміялагічнага мінімуму беларускай мовы з'яўляецца тое, што аб'ём і склад мінімуму найбольш вядомых і ўжывальных беларускіх прыказак, а таксама методыка яго ўстанаўлення застаюцца да гэтага часу дыскусійнымі. Мінімумы, якія былі вызначаны М. Ю. Котавай і Я. Я. Івановым кардынальна адрозніваюцца як па складзе, так і па аб'ёме, што, безумоўна, з'яўляецца прамым следствам, па-першае, істотных разыходжанняў у методыках парэміялагічнага эксперыменту, а па-другое, у прынцыповым адрозненні мэтаў кожнага з даследчыкаў у вызначэнні мінімуму. Супастаўленне мінімумаў беларускай мовы М. Ю. Котавай Я.Я. Іванова паказала, што яны супадаюць толькі на 56%. Гэта не выпадкова, паколькі названыя мінімумы былі атрыманы прыкладна ў адзін час, але зусім рознымі эксперыментальнымі шляхамі.

Як можна бачыць, абодва варыянты беларускага парэміялагічнага мінімуму не толькі супярэчаць адзін аднаму, але і атрыманы з пэўнымі метадалгічнымі агрэхамі, якія не дазваляюць разглядаць спісы мінімумаў у якасці рэпрэзентатыўных (такіх, якія адлюстроўваюць найбольш вядомыя і распаўсюджаныя ў мове прыказкі). Вызначэнне парэміялагічнага мінімуму беларускай мовы застаецца актуальнай і нявырашанай да гэтага часу праблемай. Найбольш важную ролю ў яе вырашэнні адыгрывае тое, якім спосабам павінен вызначацца мінімум.

У якасці аднаго з магчымых спосабаў вызначэння прыказкавага мінімуму можна прапанаваць зварот да беларускіх антыпрыказак [9], якія ў дадзеным выпадку могуць выступаць як маркеры агульнавядых прыказак, што з'яўляюцца прататыпамі (зыходнымі адзінкамі) для антыпрыказак. Гэта тлумачыцца тым, што антыпрыказкі ствараюцца для парадзіравання або высмейвання перш за ўсё шырока вядомых прыказак, паколькі ў іншым

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

выпадку пародыя або жарт, якія адлюстраваны ў антыпрыказцы, страчваюць сэнс (сваю мэту зрабіць эфект у адносінах да адрасата).

Так, напрыклад, можна без асаблівых цяжкасцей зразумець, якія прыказкі былі перафразаваны ў наступных антыпрыказках. Параўн.: Баба з воза – конь за ёю (*Баба з воза – каню лягчэй*); Бог даў, дасць і яшчэ (*Бог даў, бог і ўзяў*); Ведае сала, хто яго з'еў (*Ведае (знае) кошка, чыё сала з'ела*); Дрэнны той шаблон, які не марыць стаць стандартам (*Дрэнны той салдат, які не марыць быць генералам*); За двума камарамі пагонішся – ніводзін не ўкусіць (*За двума зайцамі пагонішся, ніводнага (ні аднаго) не зловіш*); З ваўкамі жыць – казлом не быць (*З ваўкамі жыць – па-воўчы выць*); З кім павядзешся – ад таго і захварэеш (*З кім павядзешся, ад таго <і> набярэшся*); Кату жарты, а мышцы сорам (*Катку жарты – мышцы смерць*); Кінь за сабою – нехта абавязкова падбярэ (*Кінеш за сабою – знойдзеш перад сабою*); Кожная сасна свайму бору пень пакідае (*Кожная сасна свайму бору песню спявае*); Колькі быка ні кармі, а малака не дасць (*Колькі (як) ваўка ні кармі, <а> ён у лес глядзіць*); Куранят па восені страляюць (*Куранят увосень лічаць*); Лепш дрэнна ехаць, чым дрэнна ісці (*Лепш дрэнна ехаць, чым добра ісці*); Мілыя сварацца – суседзі цешацца (*Мілыя сварацца – толькі цешацца*); На бязрыб'і і рак за руку схопіць (*На бязрыб'і і рак рыба*); Напужаная варона і вераб'я перапужае (*Напужаная варона і вераб'я баіцца*); Не кажы гоп, пакуль не гопнешся (*Не кажы гоп, пакуль не пераскочыш*); Не капай яму другому бясплатна (*Не капай другому яму, сам у яе ўвалішся*); Ня май сто рублёў, а май сто даляраў (*Не май сто рублёў, а май сто сяброў*); Рыба шукае, дзе глыбей, а чалавек – дзе рыба (*Рыба шукае, дзе глыбей, а чалавек, дзе ляпей*); Пустое месца святым не будзе (*Святое месца пустым не бывае*); Сем разоў адмерай, раз перамерай (*Сем разоў адмерай, адзін раз адрэж*); Сямёра аднаго заўсёды знойдуць (*Сямёра аднаго не чакаюць*); Хто апарыўся малаком, той халодную ваду п'е (*Хто апарыцца на малацэ, той і на ваду дзьмухае*); Хто парася ўкраў, у таго на патэльні пішчыць (*Хто парася ўкраў, у таго ў вушах пішчыць*); Што напісана пяром… мы ціхенька падатром (*Што напісана пяром, не выйме і сякера*); Язык мой – вораг твой (*Язык мой – вораг мой*) і да т.п. [7], [8], [12], [14].

Зразумела, што не кожны асобны носьбіт мовы будзе ведаць усе прагатыпы антыпрыказак (як і не кожны носьбіт мовы ведае ўсе словы ці фразеалагізмы, што шырока ўжываюцца ў маўленні). Аднак само па сабе з'яўленне антыпрыказкі, калі яна разлічана на масавае ўспрыняцце (у мове СМІ або ў мове мастацкай літаратуры), яскрава сведчыць аб тым, што тая прыказка, ад якой утворана дадзеная антыпрыказка, з'яўляецца шырока вядомай і масава ўжываецца ў маўленні.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Такім чынам, зварот да антыпрыказак з'яўляецца яшчэ адным даволі прадуктыўным спосабам дакладнага вызначэння агульнавядомых і шырока ўжывальных прыказак. Такі спосаб не належыць да эксперыментальных (сацыялінгвістычных або псіхалінгвістычных) шляхоў устанаўлення парэміялагічнага мінімуму, але дазваляе істотна ўдакладніць іх вынікі.

Спіс літаратуры

1. Англа-беларускі парэміялагічны слоўнік = English-Belarusian Paremiological Dictionary / пад рэд. Я. Я. Іванова. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. – 240 с.

2. Беларуска-нямецкі парэміялагічны слоўнік = Belarussisches-Deutsch paremiologisches Wörterbuch / Я. Я. Іваноў, Н. К. Раманава. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2006. – 108 с.

3. Валчок, Л. А. Асабісты фонд беларускіх прыказак: на матэрыяле запісаў ад У. П. Ліхтар, вёска Гоцк Салігорскага раёна / Л. А. Валчок, Ц. А. Малахоўскі ; пад рэд. Т. В. Валодзінай, А. В. Сцепулёнка. – Мінск : МАІРА, 2012. – 58 с.

4. Иванов, Е. Е. Белорусская паремиология и афористика в общеевропейском контексте (актуальные проблемы изучения) / Е. Е. Иванов // XV Міжнародны з'езд славістаў = XV Международный съезд славистов = XV International Congress of Slavists, Мінск, 20–27 жніўня 2013 г. : тэзісы дакладаў : у 2 т. – Т. 1 : Мовазнаўства / рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – С. 322–323.

5. Иванов, Е. Е. К определению понятия "основной паремиологический фонд" и его соотношение с "паремиологическим минимумом" языка / Е. Е. Иванов // Русистика и белорусистика на рубеже веков / под ред. Т .Г. Михальчук. – Могилев : МГУ им. А.А. Кулешова, 2001. – С. 27–30.

6. Иванов, Е. Е. Паремиологический минимум и основной паремиологический фонд / Е. Е. Иванов // Паремиология в дискурсе / под ред. О. В. Ломакиной. – М. : URSS : Ленанд, 2015. – С. 48–66.

7. Іванова, С. Ф. Антыцытаты ў сучаснай беларускай мове / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў // Phraseologische Studien: Dynamische Tendenzen in der slawischen Phraseologie = Динамические тенденции в славянской фразеологии / red. D. Balaková und H. Walter. – Greifswald : E. M. A.-Universität, 2010. – S. 174–183.

8. Іваноў, Я. Я. Ад прыказкі да анты-прыказкі (эвалюцыя жанру) / Я. Я. Іваноў // Українська мова серед іншпх слов'яньских: етнологічні та граматнчні параметри : матеріалп Міжнар. наук. конф., 5–6 листопада 2009 р. / Крпворізький держ. пед. ун-т ; ред. Ж. В. Колоїз. – Кривий Ріг : Видавничий дім, 2009. – С. 168–176.

9. Іваноў, Я. Я. Антыпрыказкі і праблема іх вывучэння ў сучасным беларускім мовазнаўстве / Я. Я. Іваноў, І. С. Канавалава // Веснік БДУ. Сер. 4. – 2010. – № 3. – С. 11–15.

10. Іваноў, Я. Я. Асноўны парэміялагічны фонд беларускай мовы і "Proverbiorum polonicorum" (1618) С. Рысіньскага / Я. Я. Іваноў // Паланістыка – Полонистика – Polonistyka 2006 / рэд. А. Кіклевіч, С. Важнік. – Мінск : Права і эканоміка, 2006. – С. 79–94.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

11. Іваноў, Я. Я. Афарыстычныя адзінкі ў беларускай мове / Я. Я. Іваноў. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. –Іваноў, Я. Я. Беларускія антыпрыказкі як з'ява нацыянальнай лінгвакультуры / Я. Я. Іваноў // Językoznawstwo. – 2020. – № 1(14). – S. 83–106.

12. Іваноў, Я. Я. Да праблемы вызначэння асноўнага парэміялагічнага фонду беларускай мовы / Я. Я. Іваноў // Веснік БДУ. Сер. 4. – 2006. – № 3. – С. 103–109.

13. Іваноў, Я. Я. Прыказкі і антыпрыказкі ў беларускай і іншых славянскіх і неславянскіх мовах / Я. Я. Іваноў // Славянские народы и их культуры: традиция и современность : сб. науч. ст. / ред. В. И. Коваль. – Гомель: ГГУ, 2013. – С. 137–139.

14. Іваноў, Я. Я. Сацыялінгвістычныя параметры беларускіх прыказак (да праблемы вызначэння парэміялагічнага мінімуму і асноўнага парэміялагічнага фонду сучаснай беларускай літаратурнай мовы) / Я. Я. Іваноў // Мова і соцыум : зб. навук. прац / пад рэд. Я. Я. Іванова. – Магілёў : Брама, 2004. – С. 201–224.

15. "К каждаму разгавору прыказка ё…": з вопыту вывучэння дыялектнай фразеалогіі: матэрыялы да фразеалагічна-парэміялагічнага слоўніка асобы: В. А. Грэцкая (запісы 2005–2012 гг.) : у 2 ч. / склад. Г. І. Лапацін. – Гомель, 2018. – Ч. 1. – 112 с. ; Ч. 2. – 115 с.

16. Котова, М. Ю. Очерки по славянской паремиологии / М. Ю. Котова. – СПб. : СПбГУ, 2003. – 230 с.

17. Котова, М. Ю. Русско-славянский словарь пословиц (с английскими соответствиями) / М. Ю. Котова. – СПб. : Изд-во СПбГУ, 2000. – 360 с.

18. Лепешаў, І. Я. Тлумачальны слоўнік прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – Гродна : ГрДУ, 2011. – 695 с.

19. Паремиология без границ : монография / под ред. М. А. Бредиса, О. В. Ломакиной. – М. : РУДН, 2020. – 244 с.

20. Паремиология в дискурсе : монография / В. М. Мокиенко, Т. Г. Бочина, Е. Е. Иванов [и др.] ; под ред. О. В. Ломакиной. – М. : URSS : Ленанд, 2015. – 294 с.

21. Петрушэўская, Ю. А. Паняцце парэміялагічнага фонду мовы і прынцыпы яго дыферэнцыяцыі (у сувязі з вызначэннем універсальнага і нацыянальнага кампанентаў у парэміялагічнай сістэме мовы) / Ю. А. Петрушэўская // Філалогічнй часопис. – 2015. – Вип. 1(6). – С. 100–106.

22. Петрушэўская, Ю. А. Парэміялагічны мінімум і асноўны парэміялагічны фонд беларускай мовы ў пісьмовых крыніцах і ў вусным маўленні / Ю. А. Петрушэўская // Скориновские чтения 2016: книга как феномен культуры, искусства, технологии: II Междунар. форум, 6–7 сентября 2016 г. – Минск : БГТУ, 2016. – С. 121–125.

23. Польска-беларускі парэміялагічны слоўнік = Polsko-białoruski słownik paremiologiczny / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2007. – 192 с.

24. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. / склад. М.Я. Грынблат. Мінск: Навука і тэхніка, 1976. Кн. 1. 559 с.; Кн. 2. 616 с.

25. Русско-белорусский паремиологический словарь / Е. Е. Иванов, В. М. Мокиенко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2007. – 242 с.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

26. Тетради паремиографа. Вып. 5 : Белорусские пословичные параллели русских пословиц паремиологического минимума / под ред. М. Ю. Котовой. – СПб. : Изд-во ВВМ, 2019. – 304 с.

27. Шкраба, І. Р. Крынічнае слова: беларускія прыказкі і прымаўкі / І. Р. Шкраба, Р. В. Шкраба. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1987. – 286 с.

28. Ivanov, E. "Paremiological Minimum" of the Belarusian Language / E. Ivanov // Даследаванні па германскай і славянскай філалогіі = Acta Germano-Slavica. – 2008. – Вып. 3. – С. 283–302.

29. Ivanov, E. Paremiological Minimum and Basic Paremiological Stock (Belarusian and Russian) / E. Ivanov. – Prague : RSS, 2002. – 136 p.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова